В материальной культуре белорусского народа малые исторические города – уникальное явление. Многие из них имеют богатую историю и обладают ценным историко-культурным наследием, что позволяет им развиваться как центрам туризма: исторические зоны занимают в среднем 30–50 % общей площади застроенных городских территорий, в то время как в крупных городах – не более 10 %. Несмотря на многочисленные войны и разрушения, более чем в 100 малых городах сохранились ценные памятники архитектуры и градостроительства различных эпох, в том числе 42 – памятники национального значения.

Каждый малый город имеет свой неповторимый образ, созданный его историей; культурным уровнем населения; географическим положением; уровнем коммуникационной доступности; ландшафтом местности, создающим фон для города; характером планировки и архитектуры. Малые исторические города отличает гармоничное единство с окружающим природным ландшафтом – в большинстве своем они сохраняют планировочную функциональную и визуальную связь с элементами природных систем.

Малые города Беларуси во многом сохранили следы богатейшего и непростого исторического развития государства. Они могут рассказать нам о XI–XIII вв., в них сохранились следы готической и ренессансной культур XIV–XVI вв., барокко конца XVI–XVIII вв. Множество белорусских городов возникло еще в древнерусский период. В X в. уже существовали Туров и Заславль, в XI в. – Браслав, Волковыск, Кричев, Новогрудок. В литературных источниках XII–XIII вв. упоминаются Копысь, Слуцк, Клецк, Шклов, Мстиславль, Каменец, Речица, Несвиж, Копыль, Кобрин и др.

В силу преобладания усадебной жилой застройки невысокой плотности, сохранения естественного характера рельефа местности при разнообразии природных сред Беларуси, эти поселения являют собой уникальные примеры ландшафтно-топографической согласованности пространств разной степени освоения. Ландшафтные особенности влияют и на семантику городской среды, вместе с историческими святынями давали основу названиям площадей и улиц, что является неотъемлемой составляющей своеобразия каждого города.

Многие малые исторические города, располагающие ценными памятниками архитектуры, истории, культуры (Несвиж, Мир, Туров, Мстиславль, Заславль и др.), могут выполнять, прежде всего, функции центров отдыха и туризма, что может послужить стимулом для их социально-экономического возрождения. В качестве поселений курортно-рекреационного типа уже сейчас формируются города, расположенные в зонах отдыха (Нарочь, Браслав, Лепель и др.). В особую группу выделены природоохранные города, ставшие центрами крупных природоохранных комплексов международного и национального значения.

Однако эффективное функционирование малых исторических городов как туристских центров требует развитой туристской инфраструктуры, включающей объекты проживания, питания туристов, развлечений, проведения досуга, информационного обслуживания, связи, банковских, страховых услуг, торговли, бытового, транспортного обслуживании и др.

На современном этапе в республике не должна игнорироваться объективная необходимость включения туризма в социально-экономические механизмы, направленные на качественные преобразования малых городских поселений. Для гармоничного развития туризма в системе устойчивого развития малых городов в первую очередь необходимо благоустройство градообразующей базы в связи с выполняемыми ею туристскими функциями, а также формирование сети туристских объектов в комплексе с сетью объектов обслуживания местного населения и развитие ландшафтно-рекреационных территорий.

©ПГУ

# ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД ПРАЦ ПА ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ СТАРАВЕРАЎ ПАДЗВІННЯ

***У. Я. АЎСЕЧЫК***, **У. А. ЛОБАЧ**

The article says about historiography of old-believers' history and culture of Dvina region. The main authors, editions and study approaches of old-believers' dwellings, cloths, customs and traditions, beliefs, features of family and public life on Belarussian ground are examined

Ключевые слова: гістарыяграфія, Падзвінне, гісторыя і культура старавераў

На тэрыторыі Беларусі побач з культурай карэнных жыхароў – беларусаў – сфармавалася досыць спецыфічная культура перасяленцаў з Расіі – старавераў. На Беларусь старавери сталі перасяляцца яшчэ ў 1650-я гг. з Памор'я і Ноўгарада. Беспапоўцы (паморцы, федасееўцы і філіпоўцы) аселі пераважна на паўночных землях, а папоўцы і невялікая колькасць паморцаў і федасееўцаў пасяліліся на паўднёвым усходзе Беларусі. Самым вялікім месцам пасялення папоўцаў (і наогул старавераў) на Беларусі быў горад Ветка, таму асноўная ўвага гісторыкаў і іншых даследчыкаў стараабрадніцтва на Беларусі засяроджвалася менавіта на вывучэнні гэтага рэгіёна. Таму, як слушна адзначыў А. Гарбацкі, «Калі пра папоўцаў і Ветку Гомельскай вобласці яшчэ можна сустрэць у сучаснай навуковай літаратуры асобныя эпізоды гісторыі, то пра беспапоўцаў, якія пражываюць у большай ступені ў Віцебскай вобласці, інфармацыя фактычна адсутнічае» [1, с. 3]. У дадзеным артыкуле мы ўсё ж паспрабуем ахарактарызаваць тыя нешматлікія працы, дзе разглядаюцца пытанні гісторыі і культуры старавераў Падзвіння.

У першай палове 19 ст. вывучэнне беларускага краю і культуры народаў, што тут пражывалі, адбывалася на аматарскім узроўні і было абумоўлена ўплывам Рамантызму. У гэты час выйшла праца Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» [2]. Нягледзячы на тое, што гэты твор пад уплывам эпохі мае мастацкі характар, усё ж ён утрымлівае шэраг карысных звестак, у тым ліку і аб уяўленнях беларусаў адносна «асташоў» (рускіх старавераў з Асташкаўскага павету Цвярской губерні). Праз некаторы час, у 1844 г., паплечнік і сябра Я. Баршчэўскага Р. Падбярэзскі выдаў працу «Лісты пра Беларусь» [3]. У артыкуле аўтар дае характарыстыку этнічнага складу Віцебскай губерні, а таксама звяртае ўвагу на адносіны мясцовага беларускага насельніцтва да рускіх старавераў (асташоў і булынёў – скупшчыкаў буйной рагатай жывёлы).

У пазнейшы час этнаграфічнае даследаванне Беларусі адбываецца на больш высокім прафесійным узроўні. Цікавасць да гісторыі і культуры старавераў у Расійскай імперыі тлумачылася як пратэстным стаўленнем гэтай меншасці да афіцыйнага праваслаўя, так і асаблівай культурай, найперш у выпадку пражывання ў іншаэтнічным асяроддзі. У гэты перыяд вывучэнне старавераў, як правіла, ініцыявалася праваслаўнай царквой і міністэрствам унутраных спраў Расійскай імперыі. Колькасць даследаванняў у гэты час значна павялічылася, але толькі некаторыя з іх мелі дачыненне да беларускіх зямель. У 1855 г. выходзіць праца М. Без-Карніловіча «Гістарычныя звесткі аб знамянальных месцах у Беларусі» [4], дзе апроч інфармацыі пра населеныя пункты Віцебскай і Магілёўскай губерняў аўтар змяшчае этнаграфічную характарыстыку краю. У кнізе старaверам была прысвечана асобная глава («Расіяне»). У ёй даследчык разглядаў гісторыю стараабраднікаў на беларускіх землях (у першую чаргу гісторыю веткаўскіх слабод) і коратка характарызаваў іх побыт. Сярод іншых даследаванняў таго часу неабходна ўзгадаць і працу В. Волкова «Звесткі пра пачатак распаўсюджвання і раздзялення расколу ў Віцебскай губерні» (1866 г.) [5], дзе аўтар прыводзіць шмат каштоўнай інфармацыі аб прычынах, асаблівасцях і гісторыі пасялення старавераў у Віцебскай губерні.

На Віцебшчыне ў першай палове 60-х гг. разгарнуў дзейнасць па вывучэнні гісторыі, этнаграфіі і статыстыкі А. Семянтоўскі. Асноўнай этнаграфічнай працай гэтага аўтара з'яўляецца «Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні» (1872 г.) [6]. У ёй, апроч мясцовага беларускага насельніцтва, Семянтоўскі разглядае і тыя этнічныя меншасці, што кампактна пражывалі на Беларускім Падзвінні. Раздзел «Вялікарусы» даследчык у асноўным прысвяціў апісанню старавераў, якія складалі большасць рускага насельніцтва краю. Навуковец спыняецца на гісторыі з'яўлення іх на Падзвінні, прыводзіць статыстычныя даныя аб колькасці стараабраднікаў у губерні, характарызуе іх гаспадарчыя заняткі, а таксама звяртае ўвагу на антрапалагічныя асаблівасці, адзенне і жыллё старавераў. А. Семянтоўскі адзначае таксама некаторыя пазітыўныя рысы характару прыхільнікаў старога абраду (прадпрымальнасць, працавітасць, знаходлівасць), але ў той жа час у маральных адносінах ставіць іх ніжэй беларусаў: «Раскольнікі не прызнаюць святасць шлюбу, мала даражаць шлюбнымі сувязямі, жанчыны не надаюць вялікага значэння цнатлівасці і шлюбнай вернасці. Першыя, параўнальна, значна часцей, чым беларусы, абвінавачваюцца ў крымінальных злачынствах: разбоях, крадзяжах, гвалтах, канакрадстве і г.д.» [6, с. 20].

Каштоўныя матэрыялы для даследавання побыту і культуры стараабраднікаў Беларускага Падзвіння змешчаны ў публікацыях А. Кіркора «Народнае жыццё» [8] і С. Максімава «Беларуская Смаленшчына з суседзямі» [7] ў III томе «Жывапіснай Расіі» (1882 г.). А. Кіркор прыводзіць даныя аб колькасці старавераў на беларускіх землях, гісторыі пасялення, а таксама характарызуе іх маральныя рысы, спасылаючыся на А. Семянтоўскага. С. Максімаў падае інфармацыю пра прычыны перасялення, гаспадарчыя заняткі старавераў, а таксама іх адносіны з беларускім насельніцтвам.

Карысныя гістарычныя звесткі, якія дапамагаюць раскрыць шэраг пытанняў, звязаных з пасяленнем старавераў на Падзвінні, утрымліваюцца ў артыкуле «Аб расколе ў Віцебскай губерні»

[9], што быў змешчаны ў Памятнай кніжцы Віцебскай губерні за 1885 г. Акрамя таго, у працы сустракаецца і інфармацыя пра духоўных настаўнікаў старавераў-беспапоўцаў, асаблівасці сямейнага ладу папоўцаў Віцебшчыны (заключэнне шлюбаў) і «набыццё» імі святароў. Важныя матэрыялы для даследавання традыцыйнай культуры і быту стараабраднікаў Беларускага Падзвіння змяшчаюцца ў працы В. Далгарукава «Віцебская губерня: Гісторыка-геаграфічны і статыстычны агляд» (1890 г.) [10]. У даследаванні прыведзены статыстычныя даныя аб колькасці стараверaў у Віцебскай губерні ў 1870 г., апісваецца іх жыллё, адзенне, гаспадарчыя заняткі, характарызуецца маральны ўзровень, а таксама ўтрымліваюцца звесткі пра вясельную абраднасць стараверaў-беспапоўцаў.

Характарыстыка быту і культуры стараверaў, што належыць М. Доўнар-Запольскаму і Д. Шэндэрыку, змяшчаецца ў главе «Размеркаванне насельніцтва Верхняга Падняпроўя і Беларусі на тэрыторыі, яго этнаграфічны склад, побыт і культура» IX тома кнігі «Расія. Поўнае геаграфічнае апісанне нашай Айчыны. Верхняе Падняпроўе і Беларусь» [11]. Аўтары падаюць сцісае, але дастаткова яскравае апісанне быту стараверaў, апісваюць іх сямейныя адносіны, жыллё, традыцыйную кухню, адзенне, а таксама пазначаюць характар узаемадзеяння з мясцовым беларускім насельніцтвам. Акрамя таго, у працы знаходзіцца вельмі карысная інфармацыя адносна выбару нявесты і заключэння шлюбу сярод старaверскага насельніцтва.

З іншых агульнаэтнаграфічных прац пачатку 20 ст. заслугоўвае ўвагі «Сенненскі павет Магілёўскай губерні» [12] К. Анікіевіча, народнага настаўніка, карэспандэнта і вучня Е. Раманава. У параўнальна невялікай працы Анікіевіч спрабуе даць усебаковую характарыстыку Сенненшчыны – гістарычную, геаграфічную, эканамічную і этнаграфічную. Этнаграфічны матэрыял змешчаны ў трэцім раздзеле кнігі. Аўтар прыводзіць звесткі аб колькасці стараверaў у павеце, апісвае іх жыллё, а таксама характарызуе гаспадарчыя заняткі стараабраднікаў.

Каштоўную інфармацыю адносна спецыфікі ўзаемадзеяння беларусаў і старaверскага насельніцтва змяшчае даследаванне М. Федароўскага «Віцебск і Віцебшчына» [13], якое друкавалася ў часопісе «Ziemia» амаль увесь 1912 г. У артыкуле аўтар характарызуе адносіны беларусаў са старaверамі як асцярожныя і недаверлівыя: «… у той жа час выгляд вялікарасіяніна з яго суровасцю, «шырокай натурай» і з усімі так добра нам вядомымі недахопамі для яго грозны, узбуджае ў беларуса асцярожнасць і загадвае як мага даўжэй яго пазбягаць» [13, с. 661].

Новы этап у вывучэнні стараверaў на беларускіх землях прыходзіцца на савецкі перыяд. Гістарыяграфія расколу і старaверства савецкага перыяду ўпісваюцца ў тагачасную агульную канву вывучэння гісторыі рэлігіі і царквы. Звязана гэта з тым, што з прычыны падпарадкаванасці цвёрдым ідэалагічным рамкам прадметам навуковага даследавання станавіліся строга вызначаныя пытанні. Трапляючы ў разрад атэістычнай літаратуры, даследаванні па гісторыі старaверства ў большасці выпадкаў не маглі прэтэндаваць на аб'ектыўнасць ацэнкі. Кіруючыся марксісцкім тэзісам аб другаснасці рэлігіі ў адносінах да сацыяльна-эканамічных працэсаў, савецкія гісторыкі разглядалі раскол найперш як супраціў царскаму рэжыму. У пачатку 20-х гг. на старонках часопісаў нават друкаваліся артыкулы публіцыстычнага характару ў падтрымку расколу. А у 1930 г. упершыню была выдадзеная праца Н. Нікольскага «Гісторыя рускай царквы» [14], у якой вялікая ўвага ўдзяляецца гісторыі стараверaў на беларускіх землях.

У пасляваенны перыяд з'яўляецца шэраг прац, што асвятляюць гісторыю і культуру стараверaў на беларускіх землях. Калі ў даваеннай і тым больш у дарэвалюцыйнай беларускай этнаграфіі прыярытэтнае месца займалі даследаванні традыцыйнай духоўнай культуры, у тым ліку і адносна стараверaў, то ў пасляваенныя гады асноўная ўвага надаецца матэрыяльнай культуры. У 1955 г. публікуецца дысертацыя А. Заварынай пра стараверaў Латгаліі [15]. У сваім даследаванні А. Заварына разглядае гісторыю і матэрыяльную культуру стараверaў Рэжыцкага, Люцынскага і Дзвінскага паветаў Віцебскай губерні. Рэлігійныя ўяўленні стараверaў таго ж рэгіёну (сучасная тэрыторыя Латвіі) даследаваў А. Падмазаў у сваіх працах «Стараабраднікі ў Латвіі» [16] і «Сучасная рэлігійнасць...» [17]. У 80-я гг. працягвалася вывучэнне матэрыяльнай культуры рускіх перасяленцаў. Сярод аўтараў таго часу неабходна адзначыць П. Церашковіча [26] і Г. Маславу [25].

У сувязі з крызісам марксісцкай ідэалогіі і набыццём Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці айчынная гістарычная навука, пачынаючы з 90-х гг., набыла новы імпульс для свайго развіцця. У гэты час з'явіўся шэраг сур'ёзных даследаванняў, якія прысвечаны старaверам Беларусі. Першая манаграфія па гісторыі стараабрадніцтва на Беларусі, якая насіла пераважна філасофскі характар, з’явілася ў 1992 г. (праца Т. Кароткай, Е. Пракошынай і А. Чуднікавай «Стараабрадніцтва ў Беларусі» [18]). Важная роля ў вывучэнні гісторыі і культуры старaверства Беларусі належыць А. Гарбацкаму, аўтару двух манаграфій [19; 20] і шэрагу артыкулаў па гісторыі і культуры стараверaў Беларусі [1; 23]. У гэты час з’яўляюцца і новыя накірункі ў даследаванні пазначанай праблематыкі (спецыфіка

этнакультурнага ўзаемадзеяння з мясцовым насельніцтвам, этнічныя стэрэатыпы і г.д.). Вялікую навуковую каштоўнасць маюць артыкулы У. Філіпенкі, У. Лобача, Т. Паташанка, Т. Дабжынскай і інш. [21–24].

Такім чынам, даследаванне гісторыі і культуры стараверaў Беларускага Падзвіння мае даўнюю традыцыю. За два стагоддзі пошукаў і стараннага вывучэння пазначанай праблематыкі з'явіўся шэраг прац, якія адрозніваюцца паміж сабой як паводле канкрэтных пытанняў, якія ў іх разглядаюцца, так і паводле падыходаў адносна іх асвятлення. Нягледзячы на гэта, на сённяшні дзень грунтоўнай і сістэмнай працы, прысвечанай староверам Падзвіння, пакуль не існуе, і дадзеная праблема яшчэ чакае свайго даследчыка.

**Літаратура**


1. *Гарбацкі А. А.* Стараверы Віцебшчыны ў к. XVII – XVIII стст. // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава. – 1999. - № 1 (11). – С. 3-8.
2. *Баршчэўскі Я.* Выбраныя творы. – Мн.: «Беларускі кнігазбор», 1998. – 480 с.
3. *Падбярэскі Р.* Лісты пра Беларусь // Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб. – Мн.: Маст. літ., 1994. – С. 249-266.
4. *Без-Корнилович М. О.* Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся. – СПб, 1855. – 355 с.
5. *Волков В. И.* Сведения о начале распространении и разделении раскола в Витебской губернии.– Витебск, 1866.
6. *Сементовский А.* Этнографический обзор Витебской губернии. – СПб., 1872. – 70 с.
7. *Максимов С. В.* Белорусская Смоленщина с соседями // Живописная Россия. Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Мн.: БелЭн., 1994. – С. 429-472.
8. *Киркор А.* Народная жизнь // Живописная Россия. Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Мн.: БелЭн., 1994. – С. 277-288.
9. О расколе в Витебской губернии // Памятная книжка Витебской губернии на 1885 г. – Витебск, 1885. – С. 337-367.
10. Долгоруков В.М. Население губернии // Витебская губерния. Историко-географический и статистический обзор. Вып I. – Витебск, 1890. – С. 231 – 300.
11. Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. Том 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия. – СПб, 1905. – 620 с.
12. *Аникиевич К. Т.* Сенненский уезд Могилевской губернии. – Могилев, 1907. – 148 с.
13. *Federowski M.* Witebsk i Witebszczyna // Ziemia. – 1912. – Т. 3. – S. 659 – 662.
14. *Никольский Н. М.* История русской церкви. – 3-е изд. – М.: Политиздат, 1985. – 448 с.
15. *Заварина А. А.* Русское население восточной Латвии во второй половине XIX – начале XX века: Историко-этнографический очерк. – Рига: Зинатне, 1986. – 246 с.
16. *Подмазов А. А.* Старообрядчество в Латвии.– Рига, 1970. – 112 с.
17. *Подмазов А. А.* Современная религиозность: особенности, динамика, кризисные явления. – Рига: Зинатне, 1985. – 162 с.
18. *Короткая Т. П., Прокошина, Е. С., Чудникова, А. А.* Старообрядчество в Беларуси.– Мн.: Навука і тэхніка, 1992.– 115 с.
19. *Гарбацкі А. А.* Стараабраднiцтва на Беларусі ў к. XVII – пач. XX ст. – Брэст: БрДУ; 1997. – 202 с.
20. *Горбацкий А. А.* Старообрядчество на белорусских землях. – Брест: БрГУ, 2004. – 305 с.
21. *Філіпенка У. С.* Вясельная абрадавасць стараверaў-беспапоўцаў Беларусі (па этнаграфічных матэрыялах апошняй чвэрці XIX стагоддзя) // Старообрядчество как историко–культурный феномен / Материалы международной научно–практической конференции. – Гомель: ГГУ, 2003. – С. 283-288.
22. *Поташенко Т. П.* Русские старообрядцы в ВКЛ: становление древлеправославной традиции // Мир истори. – 2002. – № 4. – С. 15 – 18.
23. *Горбацкий А. А., Добжинская Т. В.* Семейные похоронные обряды старообрядцев Витебщины в конце XIX – первой половине XX вв. (по материалам историко-этнографических экспедиций) // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – Новополоцк, 2005. – С. 52 – 54.
24. *Лобач У. А.* Вобраз «асташа» (старавера) у творах Яна Баршчэўскага // Старообрядчество как историко–культурный феномен / Материалы международной научно–практической конференции. – Гомель: ГГУ, 2003. – С. 161-166.
25. *Маслова Г. С.* Народная одежда в восточнославянских традиционных обрядах XIX – начала XX в. – М.: Наука, 1984.
26. *Церашковіч П. У.* Стараверы // Этнаграфія Беларусі: Энцыклап. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 475.


©БГТУ

## МИФОЛОГИЧЕСКИЕ ГЕРОИ СЛАВЯН

***А. Ю. БУНКЕВИЧ*, Р. В. МИКСЮК**

In this work I analysis Slav mythology and some difference in our ancient religion at some groups on the territory of our country. There were used Different methods of analysis original and critical literature, description and compaction methods. In this work I want to show that our culture directly depend from our history and our mythology. I want to show too that our ancient gods was the part of ordinary live, and relatives gods and Heroes Had more difference than some people think

Ключевые слова: мифология, язычество, славяне, бог, культ богов, поклонение природе

Постоянное исследовательское внимание к восточнославянскому язычеству присуще палеославистике, в первую очередь отечественной, практически с момента ее зарождения. Ныне данной проблематикой занимаются представители различных отраслей гуманитарного знания: историки, языковеды, археологи, этнолингвисты, этнографы, искусствоведы и др. И это закономерно. «Славян-